УДК 82.0:821.161.3.09-14

# ПОЛІСІСТЭМНЫ ХАРАКТАР ЛІРЫКІ А. ДУДАРА

***канд. філал. навук, дац. Л.М. САДКО***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры***
***Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0001-5880-1570***

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці лірыкі А. Дудара з пазіцый тэорыі полісістэмы. Устаноўлены рэпертуарныя мадэлі экспрэсіянізму ў лірыцы паэта (напружанасць эмоцый, экзальтаванае ўслаўленне новага); адзначаны рысы неарамантызму (канцэпцыя лірычнага героя-бунтара, носьбіта амбівалентных рыс); вызначаны рэпертурэмы футурызму (нігілістычны пафас адмаўлення мастацкіх традыцый, апяванне тэхнічнага прагрэсу); прааналізаваны элементы імажынісцкай ускладненай вобразнасці, асаблівасці эстэтыкі і паэтыкі незвычайнага. Зроблены высновы пра полісістэмны характар лірыкі А. Дудара, дзе канвергенцыя і злучанасць разнастайных рэпертуарных мадэлей, рысы эстэтыкі і паэтыкі розных накірункаў і плыней сусветнай і беларускай літаратур становяцца асновай фарміравання самабытнай полiпарадыгмальнай мастацкай сістэмы А. Дудара.*

***Ключавыя словы****: полісістэма, рэпертурэма, А. Дудар, «Маладняк», экспрэсіянізм, неарамантызм, футурызм, эстэтыка незвычайнага, імажынізм.*

**Уводзіны**. У беларускай літаратуры ў розныя эпохі, асабліва ў Найноўшы перыяд, назіраецца плённае суіснаванне розных па прынцыпах адлюстравання чалавека і сусвету мастацкіх накірункаў і плыняў, стылёвых праяў розных эпох. Што тычыцца вызначэнняў, якія могуць даць уяўленне пра асаблівасці функцыянавання прыгожага пісьменства Беларусі ў розныя перыяды, то даследчыкамі выкарыстоўваецца цэлы шэраг супярэчлівых разнастайных дэфініцый: «сінтэтызм», «паліморфнасць», «веерны, рознанакіраваны выгляд» (П. Васючэнка) [1], «*сінтэтызм* (вылучана Я. Гарадніцкім. – *Л. С.*) як спосаб адначасовага суіснавання і ўзаемадзеяння прыкмет розных мастацкіх метадаў, напрамкаў і плыней», калі «судакранаюцца, блізка сыходзяцца адзнакі (рэшткавыя з'явы) сентыменталізму, прыкметы класіцызму, неарамантызм, розныя віды рэалізму, праявы мадэрнізму» (Я. Гарадніцкі) [2, с. 113], «тэорыя паскоранага развіцця літаратуры» (В. Каваленка) [3], «шырыня і шматслойнасць літаратурных кірункаў» (Л. Гаранін) [4, с. 33], метад «эстэтычнай памежнасці» (В. Уткевіч) [5], «складанае перапляценне літаратурных плыняў і стылей розных эпох і культур» (М. Тычына) [6] і інш. Падобная разнастайнасць трактовак сведчыць пра пэўны дэфіцыт, абмежаванасць тэрміналагічнага апарату, закліканага даць характарыстыку складаным і неадназначным адносінам у сферы эстэтыка-літаратурнага жыцця Беларусі.

На аснове даследаванняў рускай фармальнай школы Ю. Тынянава, Б. Эйхенбаума, В. Шклоўскага ў другой палове XX стагоддзя ізраільскім культуролагам і філолагам І. Эвен-Зохарам была распрацавана тэорыя полісістэмы як перспектыўная канцэпцыя вывучэння літаратурнага працэсу ў дынаміцы. Згодна з гэтай канцэпцыяй, полісістэма разумеецца як гетэрагенны, іерархізаваны кангламерат (або сістэма) сістэм, якія ўзаемадзейнічаюць, каб выклікаць бесперапынны дынамічны працэс эвалюцыі ўнутры полісістэмы ўцэлым. Як адзначана ў «Энцыклапедыі перакладазнаўства Рутледжа», вядомага брытанскага выдавецкага дома, «полісістэмы могуць быць прыняты для ўліку з'яў, якія існуюць на розных узроўнях, так што полісістэма дадзенай нацыянальнай літаратуры разглядаецца як адзін элемент з больш шырокай сацыякультурнай полісістэмы (тут і далей пераклад наш – *Л. С.*) *(«polysystems can be postulated to account for phenomena existing on various levels, so that the polysystem of a given national literature is viewed as one element making up the larger socio-cultural polysystem, which itself comprises other polysystems»)* [7, p. 176–177]. Істотнай для гэтай канцэпцыі з'яўляецца думка пра тое, што «розныя пласты і падгрупы, якія складаюць дадзеную полісістэму, пастаянна канкурыруюць адно з адным за дамінуючае становішча» *(«the various strata and subdivisions which make up a given polysystem are constantly competing with each other for the dominant position»)* [7, p. 177]. На думку тэарэтыкаў-полісістэмістаў, розныя рэпертуарныя мадэлі (сукупнасць агульных і канкрэтных мадэлей – лексіка-сінтаксічных, жанравых, вобразна-матыўных і г.д., – што кіруюць вытворчасцю і спажываннем тэкстаў) па чарзе займаюць то дамінуючае, то перыферыйнае становішча як у літаратурным працэсе ўвогуле, так і ў творчасці пэўных аўтараў.

Па сутнасці, гэтыя ж думкі выказвалі і беларускія мысляры канца XIX – першай трэці XX ст. – М. Багдановіч, І. Абдзіраловіч, У. Самойла, В. Ластоўскі, М. Гарэцкі, А. Бабарэка, прапануючы полісістэмны падыход да вызначэння ролі слоўнага мастацтва як магутнага сродка адраджэння нацыянальнай самасвядомасці, сцвярджэння самабытнага беларускага этнасу. Згаданыя аўтары дбаюць пра абнаўленне прыгожага пісьменства, пра наданне дамінуючага становішча аўтэнтычным архаіка-міфалагічным і фальклорным вобразам, беларускаму этнаграфічнаму матэрыялу, дыялектным і «народным» моўным сродкам, а таксама імкнуцца да ўвядзення з перыферыі ў цэнтр беларускага літаратурнага працэсу агульнасусветнага мастацкага вопыту розных эпох.

Мэта дадзенага даследавання – выяўленне наватарскіх рэпертуарных мадэляў мадэрнісцкіх плыняў і напрамкаў у полісістэмнай лірыцы Алеся Дудара (сапраўднае імя Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч, 1904 – 1937).

**Асноўная частка.** Неабходна адзначыць, што ў беларускай паэзіі канца XIX – першай трэці XX ст. праяўляюць сябе рысы розных мадэрнісцкіх накірункаў і плыняў. У творчасці паэтаў-«маладнякоўцаў» часта гучыць экзальтаванае, падкрэслена экспрэсіўнае ўслаўленне новага, рэвалюцыйна-маладога. Па словах А. Бабарэкі,

«маладое – гэта адзнака эмоцыяльнай ідэёвасьці новых сродкаў і прыёмаў у мастацкай творчасьці» (захаваны традыцыі пісьма А. Бабарэкі. – *Л. С.*) [8, с. 99]. Так, у лірыцы А. Дудара, аднаго з самых яскравых і таленавітых прадстаўнікоў «маладнякоўскай» паэзіі, вылучаюцца рэпертурэмы, тэматычна і паэтычна звязаныя з асаблівасцямі экспрэсіяністкага светаадлюстравання. Як адзначаецца ў «Энцыклапедыі экспрэсіянізму», экспрэсіянізм – гэта «выбуховыя творчыя магчымасці, якія дазваляюць менавіта ў апакаліптычных пажарах адкрыць свет “зноўку”, без пасрэднікаў, сам-насам – у пульсацыі аголена чыстых каляровых плям, віхурах слоў, сцэнічнай паэтыцы ўзняўшыхся вертыкаляў-лесвіц, “ударных” момантах» (*«взрывные творческие возможности, позволяющие именно в апокалиптических пожарах открыть мир “заново”, без посредников, один на один, – в пульсации обнажённо чистых цветовых пятен, вихрях слов, сценической поэтике взметнувшихся вверх вертикалей-лестниц, “ударных” моментах»*) [9, с. 390].

Творы ранніх зборнікаў А. Дудара якраз вызначаюцца надзвычайнай інтанацыяй, пафасам абнаўлення, мяцяжу, шквалу, барацьбы. Па словах літаратуразнаўцы Г. Севярынец, «галоўнае для яго (А. Дудара. – *Л. С.*) – выказаць незвычайную па напружанні эмоцыю, бурлівую радасць абнаўлення, маладую энергію перамен, адчуць сябе рухавіком часу, чалавекам на вастрыні жыцця» [10, с. 14]. Паказальны ў гэтым сэнсе верш з характэрнай назвай «Я малады» (1924), дзе рэвалюцыя асэнсоўваецца як грандыёзная гераічная падзея, што загартавала моцнага валявога героя, дала яму магчымасць адчуваць сябе тытанам:

Хто прайшоў – галаву павесіў.
(Міліёны пудоў у гадах.)
Ну, а я малады – мне весела
разагнацца ў мяцежную даль.

Мне жыццё – сусветнае свята,
мне прапоны – большы разгон.
Я цяпер без багацця багаты
на зары квітнеючых дзён.

Гэта кроў не баіцца смерці,
гэта сэрца распаліць лёд,
гэтых думак кіпучага смерчу
не абгоніць птушыны лёт [10, с. 38].

Прыкметна праяўляе сябе ў гэтым творы канцэпцыя моцнай асобы, што склалася ў паэзіі і прозе замежнага і айчыннага неарамантызму Р. Кіплінга, Э. Растана, Р.-Л. Сцівенсана, Дж. Лондана, Я. Купалы, а таксама рысы гумілёўскага героя-воіна, максімаліста. Такі лірычны герой рэдка звяртаецца да легенд мінулага, ён шукае ідэал у сучасным моманце, прагне жыць напоўніцу тут і зараз. Сапраўды, процідзеянне духоўнай інерцыі, энергія самастойнасці, бунт супраць маральнага шаблону і бытавой умоўнасці – характэрныя рысы, уласцівыя творам неарамантыкаў.

У творах рамантызму XIX ст. цэнтральная ідэя – канцэпцыя двухсфернасці сусвету, дзе супрацьпастаўлены рэальнае і звышрэальнае, канчатковае і вечнае. Гэтая двухсфернасць спараджае асаблівую структуру мастацкага свету рамантычнага твора, пабудаванага на кантрастах і бескампрамісных супярэчнасцях. У неарамантызме наогул, і, у прыватнасці, у творах Янкі Купалы, а пазней – А. Дудара, біпалярная канцэпцыя сусвету замяняецца аднасфернай, калі звышрэальнасць скасоўваецца, саступаючы месца зямной сферы, што збліжае рамантычны метад пісьма з рэалістычным. Сферы мары і рэчаіснасці, каштоўнасці ідэальнага ў рэалізме і неарамантызме не аддалены ў часе і *прасторы*, а знаходзяцца побач з чалавекам, але патрабуюць ад яго асаблівых, надзвычайных высілкаў для спасціжэння. Як адзначае В. Талмачоў, «сумарна неарамантызм можна пазначыць як антырамантычны рамантызм і звязаць з ім спробу ўскладнення ідэалізму, яго пэўнай рацыяналізацыі» («суммарно неоромантизм можно обозначить как антиромантический романтизм и связать с ним попытку усложнения идеализма, его определённой рационализации») [11, ст. 645]. Сюжэт такіх твораў выбудоўваецца як напружаная інтрыга, прыгодніцкая гісторыя, напоўненая драматычнымі выпрабаваннямі, нечаканымі, часта фатальнымі паваротамі падзей. Янка Купала яскрава ўвасобіў асаблівага героя, што стаў характэрным для беларускай літаратуры першай трэці XX ст., – моцную асобу, здольную на ўзнёслыя пачуцці і яркія ўчынкі, што жыве ў канкрэтным, падкрэслена рэчыўным свеце. Так, у паэме «Магіла льва» (1913) рамантыка даўніны, драматычных калізій спалучаецца з дакладнасцю ў апісаннях пачуццяў і сапраўдным гістарычным каларытам. Паэт у яркіх фарбах, але пазбягаючы пасеізму, распавядае гісторыю жыцця легендарнага Машэкі, у вобразе якога знайшла ўвасабленне неарамантычная ідэя пра амбівалентнасць, недасканаласць чалавечай прыроды. Грамадскія нормы, якія адрынуў купалаўскі герой, яго спробы пабудаваць персаналісцкі асабовы кодэкс маралі пазбаўляюць Машэку арэолу сапраўднага героя-змагара, носьбіта абсалютных аксіялагічных каштоўнасцей народа. П.В. Васючэнка рэзюмуе: «Такім чынам, вандроўны рамантычны тып высакароднага разбойніка <…> у творы Купалы перажыў новарамантычную трансфармацыю» [12, с. 12]. Такі ж герой намаляваны і ў ранніх вершах «Сцеражыцеся», «Стары горад», «Паэтам рэвалюцыі», «Паўстанец» са зборніка «Беларусь бунтарская» (1925) А. Дудара. Звяртае на сябе ўвагу і неарамантычны герой Ігнась з твора «З паэмы 1920 года», што дае каманду: «Усё паліць, руйнаваць без жалю» [13, с. 11], гэты персанаж, на думку І. Багдановіч, «меў рысы досыць схематычныя, якія паўтаралі і замацоўвалі стэрэатып «сталёвага барацьбіта»« [14, с. 280].

Адзначаецца ў вершах А. Дудара, асабліва ранніх, і характэрны настрой футурыстычнай дактрыны, пралеткультаўскай ідэалогіі – аптымістычная вера ў будучыню, апантаная ўпэўненасць у мэтазгоднасць грамадскіх змен. «Мастацтва будучыні» ў аснову паклала нігілістычнае адмаўленне традыцыйнай эстэтыкі і паэтыкі, стаўленне да аўтарытэтаў згодна з лозунгам «у рожкі са старымі». А. Дудар гэты настрой увасобіў у радках верша «Стары горад» (1923): «След былога з карэннем вырвем мы / І засеем быльлём пустыр» [10, с. 36]. Такія кантрасныя вобразныя рэпертурэмы старога – цёмнага, пагібельнага, жабрачага – і новага – светлага, шумлівага, радаснага – праяўляюцца ў цэлым шэрагу вершаў першых зборнікаў «Беларусь бунтарская» і «Сонечнымі сцежкамі» (1925):

Прайшлі мы сьцежкі вузкія, да сонца мы ідзём,
Сталёвым звонам мускулаў мы Волі гымн пяём…
Ў дзень радасьці кіпучае на сьвет зьявіліся мы,
Мы – дзеці рэволюцыі, Кастрычніка сыны [10, с. 37].

У творах «Менск» (1925), «З поэмы “Сягоньньня”» (1925), «Вуліца, шырокая вуліца…» (1925), «За маім акном – абрывы…» (1925) заяўлены традыцыйныя рэпертурэмы футурызму: услаўленне тэхнічнага прагрэсу, індустрыяльных дасягненняў, падкрэслены пластычны напружаны рытм, што імітуе тэмп сучаснага жыцця. Звыклыя адзнакі сялянскага пейзажу – сонца, раніца, коні – атрымліваюць новае тлумачэнне, трансфармуюцца ва ўмовах механізаванага жыцця сучаснасці:

А мядзяныя дроты бальконаў
Напяваюць пра сьвята жыцьця.
Пахаваліся па стайнях коні –
Самалёты над Менскам ляцяць.

Сонца золатам у дах барабаніць –
Адбівае сталёвы рытм…
Як у казцы – вясёлая раніца
Вечарамі на бруку гарыць (верш «Менск») [10, с. 45–46].

Гэтыя вершы будуюцца на кантрасце традыцыйных замалёвак прыроды і падкрэсленага ўрбаністычнага пейзажа з новымі локусамі горада (трубы, слупы, балконы, брук, заводы, фабрыкі, трамваі і інш.). Развагі лірычнага героя, захопленага хуткасцю пераўтварэнняў, прыводзяць да нечаканых адкрыццяў: «Я знайшоў Беларусь ненарокам / У сырых гарадзкіх сутарэньнях», «Беларусь мая ў фабрычных трубах; / Беларусь нікім яшчэ не зьмерана» [10, с. 46]. Адзначым, што ў творах «Стары горад», «Менск», «З поэмы “Сягоньньня”», дзе рэпертурэмы футурызму трапляюць у цэнтр мастацкай сістэмы аўтара, надзвычай багатая візуальна-акустычная вобразная палітра. Кожны радок насычаны гіпербалізаванымі зрокавымі метафарамі і метафарычнымі выразамі (палітра колераў ад максімальна яркіх – «бліскавічыць слуп», «раніца… на бруку гарыць», – да падкрэслена змрочных – «закураны дымам», «невядомая шэрань»), а таксама акустычнымі сродкамі, інтэрпрэтацыямі гукавых уражанняў ад гораду і жыцця ў ім: «самалёты ляцяць», «сонца барабаніць», «сталёвы рытм», «грымяць заводы» «сотні гудкоў» і інш.

Уласцівае футурыстычнай дактрыне адмаўленне мастацкай і маральнай спадчыны, канонаў выкарыстання літаратурнай мовы або моўнага стандарту праяўляецца ў некаторых вершах А. Дудара праз зварот да стылістычна зніжанай лексікі, элементаў размоўна-прастамоўнага словавыкарыстання, як у вершы «Вуліца, шырокая вуліца…»:

Вуліца… Лягла пад дротам,
З гуляшчымі разам грашыла –
Падарожным усім за грашы
Рассыпала свае пяшчоты.

Ты прываблівай целам гарачым,
Прадавайся па кавалку за грашы.
Ня прыду і ня буду грашыць,
Як грашыў я з тымі гуляшчымі [10, с. 49].

Цікавым з пункту гледжання рытмічнай рэпрэзентацыі ўяўляецца верш «Дням не змоўкнуць» (1926), дзе А. Дудар эксперыментуе з даўжынёй радка і стварае падкрэслена энергічныя, воклічныя фразы, што ўдала перадаюць семантыку зрухаў, здзяйсненняў, заваяванняў. Такі твор выходзіць па-за межы традыцый «лінейнага» чытання, падобная мадэль выкарыстоўваецца ў брахікаланічных тэкстах авангарднай паэзіі, у тым ліку футурыстычнай:

Рвіся,
шалёны галёп
з доўгіх і цяжкіх троп.
Часу ўпартаму ў лоб
золатам коўкім строф!

Толькі ні кроку назад.
Толькі
наперад
і ўвысь…
Дзён такіх
не закілзаць.
Дням ня згубіць галавы [10, с. 64].

Эстэтыка незвычайнага, экзатычнага, распрацаваная ў творах рускага паэта М. Гумілёва, выяўляецца і ў вершах А. Дудара. Верш «Легенда» (1926) складзены з вялікай колькасці, па словах самога паэта, «вобразаў дзіўных» [10, с. 60], алюзій да культуры Усходу (Каран, Вішну, папірус, Ізіда, Асірыс, Суламіф, Хірам). Верш «Песьні, песьні! Даволі мяцежыць…» (1925) таксама пабудаваны на кантрасце досыць экзатычных для айчыннай паэзіі вобразаў пяшчотных гурый, усходніх райскіх дзеў і магутных валькірый, скандынаўскіх паннаў-ваяўніц. Паэт называе творчасць, паэтычнае слова, сваю песню то «нясмелым напевам», «срэбракованымі струнамі журбы», то «мяцежным шквалам», «сталёвымі віхурамі», уводзіць нечаканую рыфму «гурыя – валькірыя», услаўляе радасць перамен. А. Дудар у гэтым творы адмаўляецца ад спеўнага маўлення і пераходзіць да прамоўніцкіх інтанацый, дынамізуе рытмічную пабудову верша, для ўзмацнення экспрэсіі выкарыстоўвае сінтаксічны перанос:

Прыдзе час – зноў паўстануць буры,
Дні бліскучыя мятнуцца ў вырай, –
Прыдзе радасьць,
Нежная, як гурыя,
Ў ваяўнічай постаці валькірыі…
Песьні, песьні!.. З вас сілы чэрпаць,

Як паўстане ўчарайшая быль…
Ад udараў ламаецца чэрап,
У сэрцы б'е барабан барацьбы.
Празьвіняць сталёвыя віхуры,

Заляскочуць уздоўж і ўшыр.
Прыдзе радасьць
Нежная, як гурыя,
Ваяўнічая, як буйная валькірыя [10, с. 44].

Традыцыі пісьма рускага мадэрнізму, найперш гумілёўскай паэтыкі, інтанацыйна-рытмічнага малюнку, адчуваюцца і ў вершы «І ў нязнанай цьмянай далі словаў новых мы шукалі…» (1925). Тэкст пабудаваны на прыёме паслядоўнага лексічнага паўтору, калі ў двухрадкоўі наступны радок паўтарае апошнія словы першага. А. Дудар эксперыментуе з мелодыкай, рытмам верша, стварае запаволеную, медытатыўную інтанацыю замовы. Эмацыйна-экспрэсіўнае ўздзеянне гэтага твора за кошт паўтораў і асаблівай метафарычнасці дае падставы параўноўваць экзегетыку гэтага полісістэмнага верша не толькі з мадэрнісцкімі досведамі рускіх паэтаў, але і з біблейскімі тэкстамі, дзе складаныя структуры паўтору выяўляюць асаблівыя сэнсавыя акцэнты, калі радок як бы счапляецца з радком, а думка падхоплівае думку:

І ў нязнанай цьмянай далі словаў новых мы шукалі,
Словаў новых мы шукалі і ня здолелі знайсьці,
А ў жытнёвым у прасторы рассыпалі песьні зоры,
Рассыпалі песьні зоры каля возера ў трысьці.
І ня думалі ніколі, што ў нашай моцы доля.
Што ў нашай моцы доля і ня вырвецца ад нас… [10, с. 54].

І. Багдановіч заўважае ў гэтым вершы прыхаваны дыялог А. Дудара з расійскай суполкай «Таварыства вывучэння паэтычнай мовы», якое будавала новыя падыходы да мастацкага твора, што разглядаўся ў якасці канструкцыі, складзенай з розных прыёмаў, ледзь ці не механічна. Якраз адно слова з радка «Нашых думак калясьніца – гэта сьвету **апаяс**» сугучнае абрэвіятуры «ОПОЯЗ». І. Багдановіч піша: «Палемізуючы з “апаясам”, ён (А. Дудар. – *Л. С.*) фактычна адстойваў права не толькі на адлюстраванне стану душы ў паэзіі, але аспрэчваў наогул усякі дыктат над паэзіяй, над творчасцю і над асобай творцы» [14, с. 286–287].

У паэзіі А. Дудара як характэрнага прадстаўніка свайго пакалення і носьбіта «маладнякоўскай» ідэалогіі заўважаюцца таксама матывы і сродкі вобразнасці з творчасці С. Ясеніна, тэксты якога лічыліся дасканалымі ўзорамі імажынізму. М. Мушынскі адзначае: «Калі ж весці размову па вялікаму рахунку, то трэба сказаць, што ў беларускай літаратуры цікавасць да імажынізму, асновай і сцягам якога была барацьба за вобразнасць, – гэта рэакцыя на рытарычна-дэкламацыйнае вершаванне, павярхоўна-бадзёрае, але бяскрылае апісальніцтва, на якое хварэлі многія тагачасныя маладыя ды і не толькі маладыя паэты» [15, с. 30–31]. Сапраўды, камсамольска-

рэвалюцыйная ідэалогія, наколькі надзённай яна ні была б, не магла цалкам замяніць сабой усёй тэматычнай палітры прыгожага пісьменства. Асабліва заўважны алюзіўныя згадкі ясенінскіх вобразаў і стылістычных сродкаў, паэтызацыя матэрыяльнага боку жыцця ў зборніку «І залацісьцей і сталёвей» (1926), дзе тыповыя прыёмы рускага класіка – майстэрства мастацкага паўтору, кальцавая кампазіцыя, анафара, эпіфара, люстраны паўтор, рэфрэн, страфічнае кальцо – спалучаюцца з характэрнай інтымна-асабовай ідэйна-тэматычнай палітрай. Напрыклад, страфічнае кальцо, так распаўсюджанае ў ясенінскай лірыцы, выкарыстоўваецца А. Дударом у вершах «Усё загіне», «Залатавалосай», «Ціхазвонныя ды ласкавыя дні…», «Каханне», «Асыпае чэрвень белы сад…», дзе першая страфа паўтараецца ў канцы твора. Згаданыя тэксты маюць аднолькавую будову, у асноўным складаюцца з 16–20 радкоў, ці 4–5 катрэнаў, пачатковыя строфы ўтрымліваюць усе тыя тэмы і матывы, якія развіваюцца ў наступных радках і паўтараюцца ў заключнай частцы, падкрэсліваючы і рэзюмуючы думку. Сістэмна адукаваны і філалагічна дасведчаны, А. Дудар прыўносіць у полісістэму беларускай версіфікацыі трансфармаваную рэпертуарную мадэль своеасаблівага магістралу, змешчанага не ў канцы твора, як прынята, а ў яго пачатку, які выконвае ролю ключа, звязкі паміж усімі радкамі твора, метафарычнага ланцужка:

Ціхазвонныя ды ласкавыя дні
У прасторах сінякрылых без граніц…
І мой край цяпер бліжэй мне і мілей,
Песьні родныя званчэй і весялей.

Вочы сінія ды з золата каса…
Як пра шчасьце, як пра радасьць расказаць?
Стануць дні нібы з асеньніх клёнаў ліст –
Будут песьні чорналесьсе весяліць.

Ціхазвонныя ды ласкавыя дні
Плешчуць раніцай з бярозавых крыніц…
Ой вы песьні… Для сябе і для другіх
Сінім сьветам паланеюць берагі;

Сінім сьветам мармуровых, стромкіх мар.
Палыноў ды буралому больш няма.
Вочы сінія, высокі стромкі стан, –
І ўсё роўна ўжо – ці жыць, ці перастаць.

Ціхазвонныя ды ласкавыя дні…
Буду с песьняю сваёю гаманіць;
Выйдзем мы да сівагрывых дальніх гор,
Да жаданых і няпетых берагоў [10, с. 66].

Нярэдка імажынісцкая ўскладненая вобразнасць удала рэалізуецца ў вершах А. Дудара праз цікавыя метафарычныя выразы. Так, назва зборніка «І залацісьцей і сталёвей» – радок з верша «Звініць прасторамі туга», дзе А. Дудар падводзіць пэўны рахунак перыяду жыцця, разважае пра радасці і цяжкасці паэтавага жыцця, пуцявінах выпрабаванняў і расчараваннях, абвяшчае праз ланцужок метафар, што наперадзе шмат працы, што галоўныя словы, якія прынясуць плён, яшчэ не сказаныя:

Пра маем вытканую сінь
Скажу я зноў такія словы,
Каб шапацелі каласы
І залацісьцей, і сталёвей [10, с. 67].

Метафарызацыя, выкарыстаная ў апошніх радках, складаецца з некалькіх кампанентаў – з прыпадабнення і па колеры, і па матэрыяле, якасці. Вядома, выспелыя каласы шапацяць, бы металічныя, становяцца калянымі, цвёрдымі і відавочна пераліваюцца жаўтавата-бялёсымі адценнямі золата і сталі. Паэту ўдалося стварыць двухчленную метафару, дзе закадзіравана і прамая, і пераносная семантыка. Калі разглядаць катрэн цалкам, то з дапамогай складанай метафары А. Дудар ёміста і афарыстычна абвяшчае праграму сваёй творчасці: гаварыць перакanаўча, спелымі, важкімі «залацістымі» і «сталёвымі» моцнымі словамі, прыносіць плён.

**Заключэнне**. Вершы А. Дудара «Я малады», «Менск», «Вуліца, шырокая вуліца…», «Дням не змоўкнуць», «Легенда», «І ў нязнанай цьмянай далі словаў навых мы шукалі…», «Ціхазвонныя ды ласкавыя дні…», «Звініць прасторамі туга» і інш. разглядаюцца як мастацкая сістэма са сваёй самабытнай унутранай структурай і як элемент больш складанай сістэмы – у кантэксце беларускага і сусветнага літаратурнага працэсу. Згодна з метадалогіяй полісістэмы, устаноўлена, што ў лірычнай спадчыне А. Дудара праяўляюць сябе рэпертуарныя мадэлі шэрагу мадэрнісцкіх і авангардысцкіх накірункаў і плыняў: экспрэсіянізму, неарамантызму, футурызму,

а таксама імажынізму. Рысы паэтыкі экспрэсіянізму і футурызму (падкрэсленая эмацыянальнасць, надзвычайная выразнасць у адлюстраванні паслярэвалюцыйнага жыцця, сацыяльных пераўтварэнняў, рытму вялікага горада) падмацоўваюць творчыя стратэгіі беларускіх «маладнякоўцаў», адным з яскравых прадстаўнікоў якіх і з'яўляецца А. Дудар. Эстэтыка неарамантызму ўвасобілася ў творах беларускага паэта ў далейшай распрацоўцы вобраза героя эпохі – носьбіта амбівалентных рыс, моцнай асобы, што змагаецца за новае жыццё любой цаной, нават праз тэрор и гвалт, што адпавядае сацыякультурным абставінам гэтага вірлівага часу. Рэпертуарныя мадэлі імажынізму ў яго «ясенінскім» варыянце са зваротам да пачуццевай інтымна-асабовай сферы, з арыгінальнай вобразнасцю (складаная метафара, метафарычны ланцужок) і эксперыментамі ў будове верша (мастацкі паўтор, кальцавая кампазіцыя, анафара, эпіфара, люстраны паўтор, рэфрэн, страфічнае кальцо), выкарыстаныя ў вершах А. Дудара, таксама становяцца крыніцай інавацый у полісістэме беларускай літаратуры першай трэці ХХ ст.

## ЛІТАРАТУРА


1. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм / П.В. Васючэнка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : МДЛУ, 2016. – 199 с.
2. Гарадніцкі, Я.А. Мастацкая рэфлексія беларускай літаратуры як фактар актывізацыі творчых пошукаў / Я.А. Гараднiцкі // Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск : Бел. навука, 2007. – С. 101–160.
3. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць: Развіццё беларускай літаратуры XIX – XX ст. / В.А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.
4. Гаранин, Л.Я. Философские искания в белорусской литературе / Л.Я. Гаранин. – Минск : Наука и техника, 1984. – 221 с.
5. Уткевіч, В. Метад «эстэтычнай памежнасці» ў беларускай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. [Электронный ресурс] / В. Уткевіч // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сб. науч. тр. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 21. – С. 189–195. – Режим доступа: https://lib.vsu.by/jspui/handle/123456789/8699. – Дата доступа: 20.07.2021.
6. Тычына, М. А. Карані і крона: фальклор і літаратура / М. А. Тычына. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 195 с.
7. Baker, M. Routledge Encyclopedia of Translation Studies / M. Baker, K. Malmkjaer. – London ; New York : Routledge, 2001. – 654 p.
8. Бабарэка, А. Збор твораў у 2 тамах : Том 1. Літаратурна-крытычныя працы / А. Бабарэка. – Вільня : Інстытут беларусістыкі ; Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2011. – 939 с.
9. Ришар, Л. Энциклопедия экспрессионизма: Живопись и графика. Скульптура. Архитектура. Литература. Драматургия. Театр. Кино. Музыка / Л. Ришар ; науч. ред. и авт. послесл. В.М. Толмачёв ; пер. с фр. – М. : Республика, 2003. – 432 с.
10. Дудар, А. Выбраныя творы / Алесь Дудар. – Мінск : Лімарыус, 2017. – 480 с.
11. Толмачёв, В.М. Неоромантизм / В.М. Толмачёв // Литературная энциклопедия терминов и понятий / РАН, Ин-т науч. информ. по обществ. наукам ; под ред. А.Н. Николюкина. – М. : НПК «Интелвак», 2003. – ст. 640–646.
12. Васючэнка, П.В. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П.В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.
13. Дудар, А. Беларусь бунтарская / А. Дудар. – Менск [Мінск] : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. – 25 с.
14. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 387 с.
15. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады) / М.І. Мушынскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 376 с.


## REFERENCES


1. Vasjuchjenka, P.V. (2016). *Belaruskaja litaratura XX stagoddzja i simvalizm [Belarusian literature of the XX century and symbolism]*. Minsk: MDLU. (In Belarus.).
2. Garadnicki, Ja.A. (2007). Mastackaja rjefleksija belaruskaj litaratury jak faktar aktyvizacyi tvorchyh poshukaў [Artistic reflection of Belarusian literature as a factor of activation of creative searches]. In M.A. Tychyna (Eds.) *Litaratura perahodnaga peryjadu: tjearjetychnyja asnovy gistoryka-litaraturnaga pracjesu [Literature of the transition period: theoretical foundations of the historical and literary process]*. Minsk: Bel. navuka. (In Belarus.).
3. Kavalenka, V.A. (1984). *Vytoki. Uplyvy. Paskoranasc': Razviccjo belaruskaj litaratury XIX – XX st. [Origins. Influences. Acceleration: the development of Belarusian literature of the XIX – XX centuries]*. Minsk: Navuka i tjehnika. (In Belarus.).
4. Garanin, L.Ja. (1984). *Filosofskie iskanija v belorusskoj literature [Philosophical searches in the Belarusian literature]*. Minsk: Nauka i tehnika. (In Belarus.).
5. Utkevich, V. (2016). Metad «jestjetychnaj pamezhnasci» ў belaruskaj litaratury kanca XIX – pachatku XX st. [The method of «aesthetic borderline» in the Belarusian literature of the late XIX – early XX century]. *Uchenye zapiski UO «VGU im. P.M. Masherova» [Scientific notes of the Educational institution «VSU named after P. M. Masherov»], (21),* 189–195. https://lib.vsu.by/jspui/handle/123456789/8699. (In Belarusian).
6. Tychyna, M.A. (2002). *Karani i krona: fal'klor i litaratura*. Minsk: Belaruskaja navuka. (In Belarus.).
7. Baker, M. & Malmkjaer, K. (2001). *Routledge Encyclopedia of Translation Studies*. London; New York: Routledge.
8. Babarjeka, A. (2011). *Zbor tvoraў*: In 2 vol. Vol. 1. *Litaraturna-krytychnyja pracy [Literary and critical works]*. Vil'nja: Instytut belarusistyki; Belastok: Belaruskae gistarychnae tavarystva. (In Belarus.).
9. Rishar, L. (2003) *Jenciklopedija jekspressionizma: Zhivopis' i grafika. Skul'ptura. Arhitektura. Literatura. Dramaturgija. Teatr. Kino. Muzyka*. Moscow: Respublika. (In Russ.).
10. Dudar, A. (2017). *Vybranyja tvory*. Minsk: Limaryus. (In Belarus.).
11. Tolmachjov, V.M. (2003) *Neoromantizm [Neo-Romanticism]* In A.N. Nikoljukin (Eds.) *Literaturnaja jenciklopedija terminov i ponjatij [Literary encyclopedia of terms and concepts]*. Moscow: Intelvak, (640–646). ( In Russ.).

12. Vasjuchjenka, P.V. (2009). *Ad tjekstu da hranatopa : artykuly, jesje, pjatroglify [From text to chronotope: articles, essays, petroglyphs]*. Minsk: Galijafy. (In Belarus.).
13. Dudar, A. (1925). *Belarus' buntarskaja*. Mensk [Minsk]: Dzjarzhaŷnae vydavectva Belarusi. (In Belarus.).
14. Bagdanovich, I.Je. (2001). *Avangard i tradycyja: Belaruskaja pajezija na hvali nacyjanal'naga adradzhjennja*. Minsk: Bel. navuka. (In Belarus.).
15. Mushynski, M.I. (1975). *Belaruskaja krytyka i litaraturaznaŷstva (20–30-ja gady)*. Minsk: Navuka i tjehnika. (In Belarus.).

*Пастyпiў 15.09.2021*

## ПОЛИСИСТЕМНЫЙ ХАРАКТЕР ЛИРИКИ А. ДУДАРА

***Л.М. САДКО***

*В статье рассматриваются особенности лирики А. Дудара с позиций теории полисистемы. Установлены репертуарные модели экспрессионизма в произведениях поэта (напряжённость эмоций, экзальтированное прославление нового); отмечены черты неоромантизма (концепция лирического героя-бунтаря, носителя амбивалентных черт); определены репертуремы футуризма (нигилистический пафос отрицания художественных традиций, воспевание технического прогресса); проанализированы элементы имажинистской усложнённой образности, особенности эстетики и поэтики необычного. Сделаны выводы о полисистемном характере лирики А. Дудара, в которой конвергенция и слитность разнообразных репертуарных моделей, черты эстетики и поэтики разных течений и направлений мировой и белорусской литератур становятся основой формирования самобытной полипарадигмальной художественной системы А. Дудара.*

***Ключевые слова:*** *полисистема, репертурема, А. Дудар, «Молодняк», экспрессионизм, неоромантизм, футуризм, эстетика необычного, имажинизм.*

## POLYSYSTEM NATURE OF POETRY BY A. DUDAR

***L. SADKO***

*The article analyses peculiarities of the poetry by A. Dudar from the point of view of the polysystem theory. The author of the article identifies the repertoire models of expressionism in the verses by the above-mentioned poet (intensity of emotions, exalted glorification of the new); singles out the traits of neo-romanticism (the concept of the lyrical hero-rebel, who has ambivalent traits); defines the repertoireme of futurism (nihilistic pathos of the refusal from artistic tradition, glorification of technological progress), analyses the elements of imagistic complicated imagery, peculiarities of the aesthetics and poetics of the extraordinary. The author of the article draws up the basis of the polysystem nature of A. Dudar's poetry, in which the convergence and unity of various repertoire models, the features of aesthetics and poetics of different directions and currents of the World and Belarusian Literature form the basis for the creation of the original polyparadigmal artistic system of A. Dudar.*

***Keywords:*** *polysystem, repertoireme, A. Dudar, «The Young» («Maladnyak»), expressionism, neo-romanticism, futurism, aesthetics of the extraordinary, imaginism.*